**165.** Спішыце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Падкрэсліце адушаўлёныя назоўнікі, якія абазначаюць асобу.

1. Лепш дзесяць прыяцеляў, чым адзін вораг. 2. Вада сябра лепшая за мёд ворага. 3. Мудрэц свайго розуму не паказвае. 4. Блізкі сусед лепшы за дальняга родзіча. 5. Дзе маці нарадзіла, там і радзіма. 6. Лепш у сваякоў з голаду ўмерці, чым у чужакоў золата збіраць.

## § 26. Назоўнікі канкрэтныя і абстрактныя

**166.** Прачытайце верш.



Колькі той **радасці** ў чалавека!
Болей работы, **трывогі, турбот...**
Ды сустракае вясною спрадвеку
З радасцю чыстай ён птушак прылёт...
Сёння мне зранку працуецца весела:
Стукнула звонка ў шыбу **пчала,**
**Ластаўка смутак крылом** перакрэсліла,
**Ліпа** цвісці на двары пачала.

*П. Панчанка.*

Запішыце выдзеленыя назоўнікі ў пачатковай форме. Якія з іх спалучаюцца са словамі *два, дзве*? Запішыце гэтыя спалучэнні. Чаму некаторыя назоўнікі нельга палічыць?

Як вы разумееце выраз «працуецца весела»? Як вы думаеце, калі чалавеку весела працаваць?

Усе агульныя назоўнікі падзяляюцца на **канкрэтныя** і **абстрактныя.**

**167.** Прачытайце табліцу. Адкажыце на пытанні:

1. Якія назоўнікі адносяцца да канкрэтных?
2. Якія назоўнікі адносяцца да абстрактных?
3. Як адрозніць канкрэтныя назоўнікі ад абстрактных па марфалагічных прыметах?



Правообладатель Национальный институт образования

<table>
<tr><th colspan="4">Агульныя назоўнікі</th></tr>
<tr><th colspan="4">Назвы</th></tr>
<tr><td>Канкрэтныя</td><td>• адзінкавых прадметаў: аловак, палац;<br>• з’яў прыроды: дождж, гром;<br>• часавых адзінак: суткі, тыдзень;<br>• меры і вагі: метр, грам;<br>• дзеянняў: паход, падказка;<br>• людзей: вучаніца, студэнт;<br>• геаграфічных паняццяў: горад, рака;<br>• прадпрыемстваў: фабрыка, завод;<br>• твораў: аповесць, паэма</td><td>Абстрактныя</td><td>• разумовых паняццяў: сумленне, мысленне;<br>• фізічных і псіхічных адчуванняў: голад, стома;<br>• якасцей, уласцівасцей: сціпласць, дабрата;<br>• прымет: чырвань, сінь;<br>• стану, дзеянняў: сон, касьба;<br>• навуковых паняццяў: клімат, сюжэт</td></tr>
<tr><th colspan="4">Адметныя марфалагічныя прыметы</th></tr>
<tr><td>Канкрэтныя</td><td>• змяняюцца па ліках: месяц — месяцы, яблык — яблыкі;<br>• спалучаюцца са словамі два, тры і г. д.: дзве ракі, тры вуліцы</td><td>Абстрактныя</td><td>• звычайна маюць форму толькі адзіночнага ліку: дабро, сум;<br>• не спалучаюцца са словамі два, тры, але могуць спалучацца са словамі многа, мала: многа цяжкасцей, мала радасці</td></tr>
</table>

**168.** Прачытайце тэкст — нататку з газеты. Вызначце яе асноўную думку. Да якога стылю адносіцца тэкст?

Калі мы пераехалі ў наш прыгожы новы шматпавярховы дом, двор быў як лялечны. А цяпер? Адны жалезныя штыры тырчаць на месцы спартыўнага гарадка, дзе парыпваюць пад ветрам петлі, на якіх мацаваліся арэлі. Як войска вандалаў прайшло! Зразумела, што дарослы чалавек не будзе ламаць арэлі, «упрыгожваць» сцены ў пад’ездах рознымі слоўцамі, пакідаць свае «аўтографы» ў ліфце. Робяць гэта сённяшнія юныя, без выхавання і сумлення, накіроўваюць лішак* сіл на разбуральныя справы.


Правообладатель Национальный институт образования

Сум бярэ ад гэтага: падлеткі, якім ужо па сілах зрабіць нешта карыснае, выбіраюць зусім іншае... *(З газеты «Раніца»)*.

Выпішыце з тэксту пяць канкрэтных і ўсе абстрактныя назоўнікі. Чаму ў нататцы словы *«ўпрыгожваць»* і *«аўтографы»* ўзяты ў двукоссе? У якім значэнні яны ўжыты?

● Вызначце, якім спосабам утворана слова *шматпавярховы*, разбярыце яго па саставе.

**169.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак.

Неяк вясной пайшоў у лес паглядзець, ці ідзе ўжо сок з бяроз. Я ўбачыў тры дубкі, што раслі адзін каля аднаго. Яны ўяўляліся мне роднымі братамі.

Я выкапаў *(у/ў)*се тры ду*(п/б)*кі і пасадзіў іх на роўнай адлегла*(сь/с)*ці адзін ад аднаго.[сн] Хай растуць дубы, апетыя ў ка*(с/з)*ках, вершах і розных апавяданнях. Ду*(б/п)*-цар, ду*(б/п)*-волат! Веліч і прыгажо*(сь/с)*ць. Бу*(д/дз)*е ад дубоў *(у/ў)*сім кары*(сь/с)*ць: *(у/ў)*летку будуць даваць цень[ф], *(у/ў)*восень можна збіраць жалуды *(Паводле А. Федарэнкі)*.

Спішыце апошні абзац тэксту, раскрываючы дужкі.

Падкрэсліце назоўнікі. Зверху літарай *к* пазначце канкрэтныя назоўнікі, літарай *а* — абстрактныя.

Абмяркуйце са сваімі сябрамі, ці лёгка рабіць карысныя справы. Выкарыстоўваючы інфармацыю з папярэдняга практыкавання, складзіце выказванне «Якая справа, такая і слава».

**170.** Часта назоўнікі, якія ўжываюцца ў пераносным значэнні, называюць вобразы-сімвалы. Падбярыце да назоўнікаў, якія адпавядаюць малюнкам, словазлучэнні і згрупуйце іх. Запішыце сказы.




Падкрэсліце назоўнікі. Вызначце, якія назоўнікі адносяцца да канкрэтных, а якія — да абстрактных.



Правообладатель Национальный институт образования